# Нотр-Дам дэ Пары і спадчына Беларусі

15 красавіка свет ускалыхнула навіна: адбылася сапраўдная культурная катастрофа – пажар у саборы Нотр-Дам дэ Пары ў Францыі. Гатычны храм з'яўляецца не толькі сімвалам французскай сталіцы, але і скарбам сусветнай культуры. Людзі з усяго свету ехалі ў Парыж, каб паглядзець на архітэктурны шэдэўр. Ён прываблівaў шматлікіх мастакоў і пісьменнікаў.

Лёс сабора цягам стагоддзяў складваўся па-рознаму. Ён неаднаразова разбураўся і ўзводзіўся нанова. У XIX ст. храм знаходзіўся ў такім кепскім стане, што ставілася пытанне пра яго знос. Выратаванню сабора ад руйнавання і здабыццю ім славы шмат у чым спрыяў аднайменны гістарычны раман Віктора Гюго, апублікаваны ў 1831 г. У 1841 г. пачалася рэстаўрацыя, што працягвалася больш за 20 гадоў.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца ўнікальныя матэрыялы, што даюць уяўленне пра выгляд сабора ў XVIII – XIX стст. 16 красавіка ў Музеі кнігі НББ адкрылася міні-выстаўка ў знак салідарнасці і спачування, прысвечаная Сабору Парыжскай Божай Маці. На ёй да 30 красавіка можна пабачыць выданні 1830-х гг. славутага рамана В. Гюго, эстампы з відамі Нотр-Дама мастака Шарля Мер'ёна 1850-х гг., выявы інтэр'ераў сабора з каранацыйнага альбома Напалеона Банапарта 1804 г., абрысы храма на мапе Парыжа 1734 г. і інш.

Пазней стала вядома, што на аднаўленне святыні і помніка выдзеленыя вялізныя грошы. Унікальны сабор будзе захаваны. Павучыцца б нам так шанаваць свае вялікія і меншыя помнікі даўніны. Бо супала, што ў гэтыя ж дні ў Беларусі згарэў стары драўляны храм... А колькі ў агні, ад вільгаці, ветру гіне ў нас храмаў, старых бажніцаў, маёнткаў і палацаў – маленькіх ды вялікіх, пампезных і някідкіх... Гіне ад абыякавасці. Не ўсіх чакае шчасны лёс Нотр-Дама.

*Паводле інфармацыі НББ падрыхтаваў Уладзімір ПУЧЫНСКІ*